■ Натхненне

«З ДЗЯЦІНСТВА ВЕРЫЛА Ў АДЗІНАРОГАЎ...»

«Дэкрэтны водпуск — час падгузкаў, дзіцячага плачу і мыцця бялізны. Я такога не хачу!» — неяк няўмела спрабавала пераканаць сяброўку мая сакурсніца. Як аказалася, дзяўчына проста баялася страціць насычанае падзеямі прыгожае жыццё. І нават не задумвалася аб тым, што падчас дэкрэтнага водпуску можна самаўдасканальвацца і займацца творчасцю. Напрыклад, як жыхарка сталіцы Ганна ЛЯЎКОВІЧ, якая пасля нараджэння сына пачала ствараць неверагодныя цацкі-падушкі і рухомыя падвескі-мабілі для дзіцячых ложкаў.

Фота Надзеі БУЖАН.

— Па адукацыі я ўрач-рэнтгенолаг, — пачынае сваю гісторыю Ганна, якая калісьці на сталае жыхарства пераехала ў Мінск з Севастопаля. — Адпрацавала два гады па размеркаванні ў бальніцы хуткай дапамогі. Гэта вельмі цяжкае месца для працы, а тым больш для жанчыны.

— А калі ў вас узнікла жаданне нешта ствараць?

— Мой выпадак не той, калі натхненне прыходзіць знянацку. Я заўжды нешта рабіла рукамі: шыла адзенне для лялек, часам і для сваіх танцавальных выступленняў. Ствараць мяккіх адзінарогаў і бегемоцікаў пачала больш за два гады таму, калі пайшла ў дэкрэт. Мне не падабаўся ўвесь гэты пластык, што прадаваўся ў крамах, і я вырашыла спачатку зрабіць мобіль (рухомая падвеска з цацкамі, якую мацуюць над ложкам дзіцяці. — **Аўт.**) для сына. Пачала шукаць інфармацыю пра яго ў інтэрнэце. Даведалася, што такое фетр, якіх відаў ён бывае...

Гэты «мазгавы штурм» вельмі добра падтрымлівае ў тонусе розум, бо ад сядзення ў водпуску без аніякай працы можна проста атупець.

— Адкуль у нас з'явіліся гэтыя мобілі?

— Спачатку іх выраблялі ў Скандынавіі. Канструкцыі з галінак, пёраў, каменьчыкаў з рунамі. Яны лічыліся абярэгамі дзяцей ад негатыўнай энергетыкі. У Заходняй Еўропе мобілі вельмі распаўсюджаныя. І звязана гэта найперш з тым, што там ёсць культура афармлення дзіцячага пакоя. Людзі адводзяць дзіцяці асобнае памяшканне, загадзя прадумваюць, якога колеру мусяць быць шпалеры, у якой стылістыцы ўсё будзе выканана. І гэта нармальна. У нас падобнага няма, аўтарскія

мобілі попытам не карыстаюцца, але я мяркую, што і мы да гэтага дойдзем. Дарэчы, звычайныя музычныя мобілі можна набыць у краме, аднак для дзіцяці ўсё ж такі лепей, калі для яго нейкую рэч сваімі рукамі зробіць мама. Галоўнае — не вешаць цацку над галавой дзіцяці, каб не развівалася касавокасць. Канструкцыю трэба мацаваць пасярэдзіне, над ложкам, каб вугал позірку малога на цацку складаў 45 градусаў. Як мобіль успрыняў мой сын? Ён яму вельмі спадабаўся. Гэта быў першы прадмет, на якім Віця пачаў фіксаваць свой позірк.

А праз пэўны час пасля нараджэння сына я заўважыла, што ён любіць засынаць з нечым у абдымках, і я захацела зрабіць цацку-падушку, каб яму было камфортна спаць. Так усё пачалося, і тое, што я ўжо раблю, наўрад ці можна назваць хобі. Цяпер гэта мая праца. У мяне ёсць пэўная колькасць заказаў, план дзеянняў і закупак. Звычайна я працую ўвечары або ўначы.

— Колькі часу выдаткоўваеце на працу?

— Мобіль раблю ад чатырох дзён да тыдня. Насамрэч гэта ювелірная праца, усе дэталі робяцца рукамі: нешта вяжу кручком, ляплю з палімернай гліны, шыю з фетру, валяю з шэрсці, выпільваю з дрэва...Усё гэта патрабуе шмат часу. На падушкі часу ідзе менш, але на матэрыял для іх прыходзіцца выдаткоўваць больш грошай, бо працаваць прыходзіцца з дарагой тканінай. Напаўняю цацкі нашым «файбертэкам». Ён не ператвараецца ў камякі, не збіваецца і добра трымае форму.

— Герояў для падушак прыдумляеце самі?

— Сама. І я прапаную толькі тое, што мне падабаецца рабіць самой. Калі нешта раблю новае — гэта натхненне. На яго паўплываць ніхто не можа. Пры гэтым, я не мастак, не дызайнер, я проста крышачку творчы доктар. Тое, што цяпер раблю, называю сваёй самарэалізацыяй у дэкрэтным водпуску, выхадам урачэбнага патэнцыялу. Што тычыцца цацак-падушак, ствараю бегемоцікаў-гіпапаТУТаў (шмат Карнея Чукоўскага чытала) і адзінарогаў, у якіх верыла з дзяцінства. Агулам я пашыла каля сотні адзінарогаў і прыблізна пяцьдзясят бегемотаў.

— Неяк у інтэрнэце паказаў знаёмым сімпатычную аўтарскую мяккую цацку, якая каштавала каля 300 тысяч рублёў. Але прыяцелі мне сказалі, што гэта задорага.

— І ў гэтым вялікая праблема. Бо ў нас многія лічаць, што калі гэта зроблена рукамі, мусіць каштаваць капейкі. Затое нікога не хвалюе, колькі ты заплаціла за матэрыял, колькі часу працавала. На жаль, яго ніхто не ўлічвае.

«Я не мастак, не дызайнер, я проста крышачку творчы доктар. Тое, што цяпер раблю, называю сваёй самарэалізацыяй у дэкрэтным водпуску, выхадам урачэбнага патэнцыялу».

— Плагіят у вашай справе прысутнічае?

— Так, і мне здаецца, што для многіх гэта нармальная з'ява. Зразумела, напачатку ты натхняешся пэўнымі рэчамі. Аднак, адна справа, калі яны натхняюць, і зусім іншая, калі ты іх капіруеш. Навошта абмяжоўваць свае фантазіі прывязкамі да канкрэтнага прадмета?

— Наша нядаўняя гераіня Настасся Галкоўская, мылавар, прызналася, што амаль не ўяўляе сябе ў гэтай ролі ў 40-гадовым узросце. А вы ўяўляеце, што праз 10-15 гадоў будзеце памнажаць і памнажаць цацкі-падушкі?

— У свой час мне падабалася працаваць фельчарам-лабарантам. Праца вельмі дынамічная, ты ніколі не сядзіш на месцы. Мне хацелася працаваць доктарам. Праўда, тата мне неяк сказаў: «Дачушка, табе не заўжды будзе 20 гадоў. У свае 50 ты не будзеш атрымліваць асалоду ад таго, што ўвесь час бегаеш». І я не хачу, каб так было. Я спакойна дасяджу дэкрэт, буду займацца выхаваннем сына, а пасля вырашу, што рабіць далей.

— Як лічыце, для жанчыны, якая знаходзіцца ў водпуску па доглядзе дзіцяці, стварэнне, напрыклад, цацак-падушак — добрае хобі?

— Цудоўнае! Гэта падтрымлівае дробную маторыку, а яна станоўча ўплывае на мазгавую дзейнасць. Дзеткі любяць перабіраць дробныя рэчы, нанізваць пацерачкі, маляваць пальчыкавымі фарбамі. Мы, заўважце, таксама ў чымсьці не мяняемся. Толькі сталеем. А таму ўсім раю займацца хэндмэйдам, вязаць і вышываць. Падтрымайце свой розум.

Тарас ШЧЫРЫ.
taras@zviazda.by

■ Можа быць

Чысціня без хіміі

Аднойчы ў краме з экзатычнымі таварамі на мае вочы трапіліся індыйскія арэхі, дужа прывабныя на выгляд. Прадавец патлумачыў: яны не для ежы, а для... мыцця. «Рэцэпт» наступны: замачыць арэхі ў гарачай вадзе на 5 хвілін, пасля крыху пацерці іх — убачыце пену. Можаце мыць бялізну, а можаце і выкарыстоўваць у якасці мыла для цела.

Забягаючы наперад, падзялюся вопытам: з мыльных арэхаў атрымліваюцца нядрэнныя гелі для душа. Праўда, прызнаюся: далейшае знаёмства з заморскімі дарамі не склалася. Адзін толькі водар размочаных арэшкаў адбіў далейшае жаданне імі карыстацца. Але размова не пра тое. Насамрэч, прыбрацца ў кватэры можна, выкарыстоўваючы сродкі, якія заўжды ёсць пад рукой. Намеснік дырэктара ўстановы «Цэнтр экалагічных рашэнняў» Дар'я ЧУМАКОВА расказала, чым можа быць небяспечна для нас бытавая хімія. А ў якасці альтэрнатывы мы зрабілі падборку простых натуральных і экалагічных сродкаў для мыцця і прыборкі.

ЧЫТАЙЦЕ ЭТЫКЕТКІ!

Аказваецца, у аснове многіх сродкаў для мыцця посуду і бялізны знаходзяцца паверхнева-актыўныя рэчывы (ПАР). Дзякуючы ім бруд лёгка выдаляецца. Аднак ёсць у іх небяспечнае «але»: калі мыем посуд альбо апранаем памытае парашком адзенне, аніённыя ПАР назапашваюцца ў арганізме: у нырках, лёгкіх, мозгу, печані. Дар'я раіць выбіраць сродкі з мінімальнай колькасцю аніённых ПАР. Пасля мыцця посуд лепш апалоскваць як мага даўжэй.

Фасфаты альбо **фасфанаты** выклікаюць алергічныя рэакцыі скуры і пашкоджанне дыхальных шляхоў. Трапляючы ў вадаёмы, яны становяцца ўгнаеннем для водарасцяў, праз гэта пачынае цвісці вада. «Выбіраючы парашок, аддавайце перавагу тым, у якіх фасфаты заменены на цэаліты альбо палікарбаксілаты, прыродныя змякчальнікі вады. Калі такой магчымасці няма, то пашукайце парашок, у саставе якога менш за 5% фасфатаў, — адзначыла спецыяліст. — Дарэчы, выкарыстанне гэтых рэчываў у парашках і сродках для мыцця посуду забаронена ў краінах Еўрасаюза».

У сродках для мыцця шкла выкарыстоўваецца **аміяк.** Яго пары могуць выклікаць часовае спыненне дыхання і ацёк верхніх дыхальных шляхоў, а таксама аміяк раздражняе слізістыя абалонкі, выклікае апёкі.

НАТУРАЛЬНАЯ АЛЬТЭРНАТЫВА

Для ручнога мыцця бялізны вазьміце здробненае на буйной тарцы гаспадарчае мыла. Для машыннага прання адзення выкарыстайце мыльныя арэхі: проста пакладзіце іх у палатняны мяшэчак і кіньце разам з бялізнай. Але з цяжкімі выпадкамі — плямамі тлушчу, крыві, суніц — гэты сродак не справіцца. Таму лепей апрацаваць іх загадзя: калі яны свежыя, натрыце іх звычайнай соллю.

Адбельвальнік для бялізны можна зрабіць наступным чынам: змяшаць 2-3 сталовыя лыжкі пераксіду вадароду і столькі ж нашатырнага спірту. Вельмі лёгка робіцца і натуральны асвяжальнік паветра: проста капніце на ватныя шарыкі 2-3 кропелькі эфірнага алею і пакіньце іх у прыбіральні. Прыемны водар гарантаваны!

Памыць падлогу таксама можна з дапамогай раствору з гаспадарчага мыла. Лепей выбіраць кавалкі цёмна-карычневага колеру: менавіта ў іх маецца неабходная колькасць натуральных актыўных шчолачаў. Калі ў вас плітачная падлога, то дабаўце ў раствор воцат.

Сода — выдатны змагар за чысціню. Нават у халоднай вадзе яна здольна адмыць посуд. Праўда, з «моцным» тлушчам сода не заўжды эфектыўна «працуе». Варыянты два — альбо адмываць посуд даўжэй, альбо дабавіць парашок гарчыцы і лімонную кіслату — разам яны справяцца лепш. Можна дадаткова наткаваць гаспадарчага мыла — тады сродак для мыцця посуду «запеніцца» і пачне мыліцца.

Гарчычны парашок выдатна распускае тлушч. Зрабіце раствор, проста дабавіўшы вады. Нанясіце губкай «кашу» на пліту і пакіньце на 10 хвілін, пасля змыйце.

Лімон справіцца з накіпам у чайніку — нарэжце яго, пакладзіце ў чайнік і пракіпяціце ваду ў ім два разы. Сок лімона знішчае непрыемныя пахі. Калі ў вашым халадзільніку пах такі, быццам нешта пратухла, зрабіце раствор з лімоннага соку і вады, выкарыстаўшы кожны інгрэдыент у роўнай прапорцыі. А калі маеце справу з такімі пахучымі прадуктамі, як часнок, цыбуля, рыба, то пратрыце апрацоўчую дошку і рукі долькай лімона — і непрыемны пах знікне. Лімон надае бляск посуду з нержавейнай сталі і сталоваму серабру.

Воцат — майстар дэзынфенкцыі. Ён спраўляецца з васковымі плямамі і накіпам, ачышчае кафель, шкло. На аснове воцату эколагі раяць рабіць сродкі для чысткі падлогі, пліткі, сваёй сантэхнікі, шкла. Прыбіральню і ванны такой можна прыбіраць як чыстым воцатам, так і растворамі: дадайце некалькі кропляў эфірнага алею піхты, сасны альбо цытрусавых. Брудныя вокны? Вазьміце лупіны цытрусавых, заліце іх прыкладна літрам сталовага воцату, закаркуйце і пакіньце настойвацца цягам двух тыдняў. Атрыманы раствор працадзіце і разбаўце вадой у прапорцыі 1:1. Воцат вяртае таксама фарбы дывану. Зрабіце раствор з воцату і вады ў прапорцыі 3:1 і папрацуйце са шчоткай. Перад гэтай працэдурай дыван лепш прапыласосіць. Пасля апрацоўкі растворам ён будзе выглядаць свежанькім — колеры зайграюць з ранейшай яркасцю.

Кацярына РАДЗЮК.
radziuk@zviazda.by